This article is distributed under the terms of the Creative Commons Attribution 3.0 PL
© Copyright by Uniwersytet Warszawski Katedra Studiów Interkulturowych Europy Środkowo-Wschodniej & individual articles to their Authors

doi: 10.32612/uw.2543618X.2024.pp.51-85

Przegląd Środkowo-Wschodni, 9, 2024
ISSN 2543-618X eISSN 2545-1324

Nr art. 20240902

Data przesłania: 30.11.2023
Data akceptacji: 03.01.2024

**Юрый Тамковіч**

незалежны даследчык
yuratamkovich@mail.ru
ORCID: 0009-0001-3878-6526

# Феномен рыцарства ў Вялікім Княстве Літоўскім у XIV – XVI стагоддзях: гістарыяграфія пытання

Artykuł traktuje o problematyce badań nad rycerstwem w Wielkim Księstwie Litewskim na przestrzeni ostatnich 120 lat – od początku XX wieku do czasów współczesnych. W pierwszej kolejności dokonano przeglądu głównych dzieł z zakresu historii rycerstwa, które wyszły spod pióra badaczy zachodnioeuropejskich: M. Keen, J. Fleury, J. Hoesing, J. Bumke i innych. Następnie poddano analizie prace naukowe bezpośrednio związane ze zjawiskiem rycerstwa w Wielkim Księstwie Litewskim: przedrewolucyjnych historyków rosyjskich (M. Daszkiewicz, M. Lyubauski, F. Leontowicz) i współczesnych badaczy litewskich i białoruskich (E. Hudavichus, R. Petrauskas, K. Antonaitis, A. Nikzhentaitis, Y. Kyavpene, Y. Bohan). Autor zauważa, że temat ten został po raz pierwszy podniesiony na początku XX wieku, jednak przez długi czas, w okresie dominacji marksistowskiego podejścia do historii, problem ten był prawie niezbadany. Dopiero w latach 90. i po XX w., na tle kryzysu sowieckiej tradycji historiograficznej, w litewskiej i białoruskiej nauce historycznej rozwinął się nurt badawczy dotyczący dziejów rycerstwa w WKL. Większość tekstów naukowych ukazała się w litewskim środowisku akademickim. Nauka białoruska niewiele uwagi poświęca problematyce rycerstwa, a właściwie jedynym historykiem, który poważnie zainteresował się tym tematem, był Jurij Bokhan.
Słowa kluczowe: rycerz, rycerstwo, elita, arystokracja, Średniowiecze, historiografia, WKL, wojna, kultura

Мы прызвычаіліся да стэрэатыпнага ўяўлення пра рыцарства: „ваякі на грозных канях” у цяжкіх даспехах, якія „срэбнай збруяй далёка грымяць”[1]. Як вы, напэўна, заўважылі, гэтае апісанне ўзятае з верша класіка беларускай літаратуры Максіма Багдановіча – паэтычным словам ён паспрабаваў апісаць старадаўні герб Вялікага Княства Літоўскага (далей – ВКЛ) – „рыцера збройнага на кане з мечам”[2]. Аднак, што мы ведаем пра рыцарства на землях Літвы і Русі? Нягледзячы на тое, што рыцар змяшчаўся на гербе даўняй славяна-балцкай дзяржавы, а сам феномен рыцарства стаў мегапапулярным ва ўсёй Еўропе, пра дадзеную з’яву на тэрыторыі ВКЛ мы ведаем мала. У нашым артыкуле мы паспрабавалі сабраць у адным месцы той корпус навуковых наратываў, якія падводзяць да раскрыцця феномену рыцарства ў Вялікім Княстве Літоўскім.

## Рыцарства ў заходнееўрапейскай гістарыяграфіі

Аднак перад тым, як звярнуцца да даследванняў, што тычацца тэрыторый ВКЛ, нам будзе карысна пазнаёміцца з асноўнымі працамі еўрапейскіх навукоўцаў па тэме рыцарства. Для таго, каб разабрацца ў гісторыі феномена рыцарства ВКЛ, трэба даведацца, як рыцарская ідэя пранікла на літоўскія і ўсходнеславянскія тэрыторыі, якімі былі яе карані, як яна ўзнікла. У кароткім аглядзе, вылучым некалькі гісторыкаў, чые работы, на наш погляд, найбольш поўна даюць адказ на пастаўленныя пытанні.

Падручнікам па вывучэнні сусвета чалавека эпохі Позняга Сярэднявечча можна назваць працу нідэрландскага гісторыка і культуролага Ёхана Хейзінгі „Восень Сярэднявечча”[3]. У сваім

[1] *Поўны збор твораў / Максім Багдановіч*, Т. 1: *Вершы, паэмы, пераклады, наследаванні, чарнавыя накіды / падрыхтоўка тэкстаў і каментарыі: Э.А. Золавай, Т. Р. Строевай, Л. У. Хрышчановіч.* Мінск: Навука і тэхніка, 1992. С. 314.

[2] *Густынская летопись* / Рос. акад. наук, Ин-т рус. лит. (Пушкин. дом). СПб.: Дмитрий Буланин, 2003. – (Полное собрание русских летописей; Т. 40). С. 125.

[3] Гл.: Й. Хейзинга, *Осень Средневековья*. Санкт-Петербург 2022.

сацыякультурным аналізе аўтар дае падрабязную характарыстыку свету ідэй вышэйшых колаў сярэднявечнага грамадства, у тым ліку рыцарства. Асаблівую ўвагу аўтар звяртае на гісторыю штодзённасці, мастацтва і культуру, а ў якасці глебы для даследвання абірае Бургундыю XIV–XV ст., якая дала яму вялікі корпус літаратурных, дакументальных, рэлігійных і мастацкіх крыніцаў. Адной з цэнтральных тэмаў кнігі ёсць рыцарства – гэтаму феномену прысвечана некалькі раздзелаў. Аўтар лічыць, што характэрнай рысай таго часу было панаванне „рыцарскай ідэі": ідэі пра асаблівае прызначэнне арыстакратыі, пра каштоўнасць цноты, вернасці і самаадданасці, пра імкненне да гераічных подзвігаў і воінскай доблесці, пра рамантычную любоў да Дамы, далёкія паходы і турніры. У кнізе даецца аналіз уплыву „рыцарскай ідэі" на вайну і палітыку, разглядаецца феномен рыцарскіх ордэнаў і цнот.

Іншая асоба, якую нельга абмінуць, Жан Флары – адзін з самых таленавітых паслядоўнікаў французскага медыявіста Жоржа Дзюбі, які вядомы як спецыяліст у пытаннях мілітаранай гісторыі сярэднявечнай Еўропы. Ягоная кніга „Ідэалогія мяча"[4] падрабязна аналізуе фармаванне ідэалогіі рыцарства. Навуковец стварае панараму эвалюцыі поглядаў на вайну і ролю ваяра ў раннесярэднявечным грамадстве. Ён звяртае ўвагу на тое, што менавіта ў дадзены перыяд быў сфармаваны кодэкс „рыцарскага гонару", які аказаў значны ўплыў на еўрапейскую культуру пазнейшых вякоў.

Другая кніга Флары „Рыцары і рыцарства ў Сярэднявеччы"(у рускім перакладзе „Паўсядзённае жыццё..")[5], з'яўляецца працягам „Ідэалогіі". Гэта апавяданне пра перадгісторыю і пачаткі рыцарства, пра гісторыю зменаў разумення тэрміна „рыцар" у сярэднявечным грамадстве. Аўтара вельмі займала пытанне адпаведнасці рыцарскага міфа сапраўднай гісторыі, у сваёй спробе

---

[4] Ж. Флори, *Идеология меча: Предыстория рыцарства* / Жан Флори. – СПб.: Изд. группа «Евразия», 1999.

[5] Ж. Флори, *Повседневная жизнь рыцарей в Средние века: [перевод с французского]*. Москва 2006.

дайсці да праўды Флары абвяргае распаўсюджаныя гістарычныя памылкі. Агулам аўтар падымае цэлы комплекс пытанняў: паходжанне рыцарства, сістэма васальна-феадальных адносінаў, рыцарская ідэалогія і адносіны з Царквой, літаратура, турніры, змены ў тактыцы бою, крыжовыя паходы.

Пры вывучэнні рыцарства нельга абмінуць постаць брытанскага гісторыка Морыса Кіна. Ва ўводным слове да кнігі „Рыцарства”[6] навуковец піша пра сваю дзіцячую любоў да прадмету даследвання, з якой ён яго і апісвае. У кнізе даследуюцца вытокі рыцарства, ягоныя адносіны з царквой, крыжовыя паходы, эвалюцыя турнірнай справы, міфалогія рыцарства. Кін дае сваё ўласнае вызначэнне рыцарства, акрэслівае аспекты, якія фармавалі вобраз рыцара, дае характырыстыку крыніцаў па тэме і апісвае важнейшыя з іх.

Аўтар кнігі „Паняцце рыцарства ў Сярэднявеччы”[7] Ёахім Бумке актыўна вывучаў сярэднявечную нямецкую літаратуру – менавіта яна стала крыніцазнаўчай базай даследвання. Кніга даволі поўна тлумачыць канцэпцыю рыцарства ў Сярэднія вякі. Цэнтральнымі тэмамі ў ягонымі даследванні сталі: эвалюцыя слова „рыцарства”, разгляд рыцара ў вобразе жаўнера, слугі, прадстаўніка шляхецкага стану. У першую чаргу Бумке звяртаецца да нямецкага рыцарства, аналізуючы дакументы напісаныя на раннегерманскіх дыялектах. Гісторык выступае супраць існавання цэльнай канцэпцыі рыцарства (дарэчы, як і Флары) – адзначаючы, што на працягу Сярэдніх вякоў тэрмін „рыцар” меў розныя значэнні.

Неабходна спыніцца і на даследванні брытанскага гісторыка Роберта Джонса „Гісторыя рыцарства”[8], якая ахоплівае гісторыю еўрапейскага рыцарства з XI па XVI стагоддзе. Аўтар аналізуе эканамічныя, сацыяльныя, культурныя і рэлігійныя аспекты развіцця рыцарскага стану, расказвае пра асаблівасці рыцарскага кодэкса

[6] М. Кин, *Рыцарство.* Москва 2000.
[7] J. Bumke, *The Concept of Knighthood in the Middle Ages.* New York, 1982.
[8] Р. Джонс, *История рыцарства.* Москва 2014.

гонару, ролю рыцараў у кіраванні дзяржавай. У кнізе ўсебакова апісваецца жыццё рыцарства на працягу чатырох стагоддзяў, расказваецца аб эвалюцыі іх прававога і сацыяльнага статусу, сістэмы навучання, вонкавага выгляду, а таксама рыцарскай культуры і традыцый.

## Гістарыяграфія феномена рыцарства ў ВКЛ

Пераходзячы да пытання рыцарства ў Вялікім Княстве Літоўскім мы павінны прыгадаць прозвішчы некаторых гісторыкаў, якія працавалі ў канцы XIX – першай палове XX ст. Асабліва ў гэтым шэрагу вылучаецца постаць расійскага гісторыка і літаратуразнаўцы Мікалая Дашкевіча. Мікалай Паўлавіч спецыялізаваўся на вывучэнні гісторыі Паўднёвай Русі і ВКЛ, абгрунтоўваў сувязь сюжэтных ліній заходнееўрапейскага і ўсходнеславянскага фальклору, старажытнарускіх былінаў і украінскіх думаў. Арыгінальнай з'яўляецца яго прамова (пазней надрукаваная) „Рыцарства на Русі – у жыцці і паэзіі”[9]. У ёй даследчык выкарыстоўвае характэрны для яго параўнаўчы аналіз. Дашкевіч паказвае, як рыцарская культура пранікала на тэрыторыю Русі і Літвы, а таксама адзначае, што гэтыя землі таксама ўваходзілі ў арыял распаўсюду ідэалаў рыцарства. Пры дапамозе дакументальных крыніцаў, літаратурных твораў і фальклора ён даводзіць, што паноўны стан украінска-беларуска-літоўскіх земляў XII–XVII стагоддзяў: дружыннікі, шляхта, казакі мелі агульныя рысы з заходнееўрапейскім рыцарствам. Дашкевіч прыходзіць да высновы, што „рыцары” Заходняй Русі і Літвы значна адрозніваліся ад заходнееўрапейскіх, аднак яны часткова перанялі рыцарскую ідэалогію і перыядычна выкарыстоўвалі найменаванне „рыцарства”. Акрамя таго аўтар вылучае два перыяды пранікнення рыцарскай ідэалогіі на землі Украіны, Беларусі

[9] Н. П. Дашкевич, *Рыцарство на Руси – в жизни и поэзии: [речь, произнесенная 27 октября 1899 г.*]. Киев 1902.

і Літвы: перыяд Старажытнай Русі (XII – першая палова XIII ст.) і эпоха ВКЛ/Рэчы Паспалітай (канец XIV–XVII ст.).

Сучаснік Дашкевіча прафесар Маскоўскага ўніверсітэту Мацвей Любаўскі ў сваёй працы „Нарыс гісторыі Літоўска-Рускай дзяржавы да Люблінскай вуніі ўключна”[10] прыходзіць да высновы, што ў ВКЛ сфармавалася цалкам адпаведная еўрапейскай сістэма феадальных адносінаў са сваёй уласнай „шляхтай-рыцарствам”. Пра распаўсюд тэрміна „рыцарства” і ягоных „звычаяў” на Літоўскую Русь з Польшчы піша ў “Літоўска-Рускім сейме”[11]. Гісторык сцвярджае, што рыцарства ў ВКЛ было „не пустым гукам”, а рэальнай з’явай з усімі рысамі, якія былі ўласцівы заходнееўрапейскай шляхце.

Прафесар Варшаўскага ўніверсітэта Фёдар Леантовіч у сваёй працы „Баяры і служылыя людзі ў Літоўска-Рускай дзяржаве”[12] кажа пра „старых літоўска-рускіх „рыцараў”, ці „milites”, якія не былі тым самым, што і шляхта. Леантовіч лічыў, што рыцарства было асаблівай часткай шляхецкага стана, якая выконвала вайсковую службу і сваімі каранямі ўзыходзіла да старажытнарускіх дружыннікаў. У артыкуле „Правараздольнасць літоўска-рускай шляхты”[13] ён зноў агучвае гэтую ідэю, гаворачы пра тое, што літоўска-рускае рыцарства з’яўляецца ў дакументах XV–XVI ст. у якасці ваенна-служылай часткі шляхты, якая адрознівалася ад буйных феадалаў і служылай шляхты, знаходзячыся ў сацыльна-прававым плане паміж імі.

На жаль, гэтыя першыя крокі расійскіх навукоўцаў да даследвання праблемы рыцарства ў ВКЛ, былі спыненыя з Рэвалюцыяй

[10] М.К. Любавский, *Очерк истории Литовско-Русского государства до Люблинской унии включительно: с приложением текста хартий, выданных Великому княжеству Литовскому и его областям*. Москва 1915.

[11] М.К. Любавский, *Литовско-русский сейм: опыт по истории учреждения в связи с внутренним строем и внешней жизнью государства*. Москва 1900.

[12] Ф.И. Леонтович, *Бояре и служилые люди в Литовско-Русском государстве* [w:] *Журнал министерства юстиции*. №15. 1907.

[13] Ф.И. Леонтович, *Правоспособность литовско-русской шляхты* [w:] *Журнал министерства народного просвещения*. Новая серия. Ч. 15. 1908.

і доўгі час да пытання не вярталіся. У савецкі час, пры панаванні класавага падыходу, не было вялікай патрэбы ў вывучэнні фенемена рыцарства. Да таго ж гісторыкам „хапала" разгляда арыстакратычнага мілітарнага стану ў выглядзе шляхты, дваранства. Больш глыбокае вывучэнне праблемы рыцарства як часткі мілітарнай культуры ВКЛ пачалося адносна нядаўна. Пачынальнікамі былі літоўскія даследчыкі, якія шукалі і шукаюць у гісторыі старой Літвы праявы з'яваў, характэрных для цывілізацыі сярэднявечнага Захаду. Для сучаснай літоўскай дзяржавы, якая ўваходзіць у склад аб'яднанай Еўропы, вельмі важна рэпрэзентаваць сябе ў ідэалагічным, а значыць і гістарычным плане як частку заходнееўрапейскага света. Рыцарская культура – гэта адзін са слупоў еўрапейскай цывілізацыі і свядомасці. Больш за тое папулярнасць рыцарскага міфа распаўсюдзілася і на тыя тэрыторыі, дзе гістарычна рыцарства не існавала – якія падпалі пад уплыў заходнееўрапейскай цывілізацыі ў Новы час. Таму для гісторыкаў Літвы тэма рыцарства з'яўляецца адным з "масткоў", які звязвае іх дзяржаву, якая ўвайшла ў "сям'ю еўрапейскіх народаў" даволі позна, з цэнтральнымі краінамі Старога Свету. У пошуках свайго ўласнага рыцарства, літоўская гістарыяграфія зрабіла вялікі крок у распрацоўцы праблемы

Пры гэтым, на дадзены момант кола даследчыкаў, якія звярталіся да акрэсленай тэмы адносна невялікае, а іх напрацоўкі пакуль абмежаваны навуковымі артыкуламі. Сярод піянераў у вывучэнні феномена рыцарства ВКЛ былі літоўскія гісторыкі Эдвардас Гудавічус і Станісловас Лазутка, якія яшчэ ў 1981 г. апублікавалі невялікі артыкул „Рыцары"[14]. У ім аўтары даюць вызначэнне тэрміна „рыцар", кажуць пра ягоную неадзначнасць. На думку аўтараў рыцарствам можна назваць і ўвесь шляхецкі стан разам, і асобны пласт дробнага шляхецтва ў вузкім сэнсе. Рыцарства як з'ява „раскладаецца" на аснову – сацыяльна-маёмасныя адносіны і ідэалагічную

[14] E. Gudavičius, S. Lazutka, *Riteriai* [w:] *Lietuvos istorijos metraštis. 1980 metai.* – Vilnius 1981. P. 105–109.

надбудову ў выглядзе рыцарскай культуры з яе атрыбутамі. Пасля агульнага апісання тэрміна аўтары пераходзяць да яго ўжывання ў ВКЛ. Яны робяць выснову, што рыцарства ў ВКЛ існавала, мела адпаведную заходнееўрапейскай сацыяльна-эканамічную базу, але „ідэалагічная надбудова" ў поўнай меры ў Літве не сфармавалася. Пазней Гудавічус звяртаўся да пытання „рыцарства". У артыкуле „Асаблівасці арганізацыі літоўскага прызыўнога войска"[15] і сваёй „Гісторыі Літвы"[16] навуковец паўтарае папярэднія высновы. Ён піша, што ў ВКЛ аформілася цалкам еўрапейская сістэма феадальных адносінаў са сваім рыцарствам, якое часцей звалася шляхтай ці баярамі (тэрмін „рыцарства" быў не самым папулярным ў паноўнага стану). Пры тым, даследчык сцвярджае, што калі ў сацыяльнымі і мілітарным плане вялікалітоўскае „рыцарства" адпавядала заходнееўрапейскаму, то ў культурным узроўні розніца была вялікая: у Княстве не быў шырока распаўсюджаны кодэкс рыцарскага гонару, культ Дамы і іншыя элементы рыцарскай, куртуазнай культуры. Адзначым, што ў сваіх працах аўтар звяртае шмат увагі на зямельныя адносіны, механізмы фармавання паспалітага рушання. Тэксты Гудавічуса напісаныя ў марксісцкай традыцыі, хоць пасля атрымання Літвой незалежнасці з іх і знікла адпаведная ідэалагічная тэрміналогія. Іншым бачацца наратыў маладзейшых літоўскіх гісторыкаў, якія працягваюць вывучэнне тэмы, паднятай Гудавічусам і Лазуткай, але ў адрозненні ад іх звяртаюць больш увагі на культурныя асаблівасці феномена рыцарства ВКЛ.

У 1990–2000-ыя гг., у сувязі з атрыманнем літоўскай гістарычнай навукай метадалагічнай і ідэалагічнай незалежнасці ад савецкай гістарычнай парадыгмы, да праблемы звярнуліся зноў. Даволі поўна апісаны феномен рыцарства ВКЛ Рымвідасам Пятраўскасам у артыкуле „Рыцарства ў Вялікім Княстве Літоўскім з канца XIV

[15] E. Gudavičius, *Lietuvių pašauktinės kariuomenės organizacijos bruožai* [w:] *Karo archyvas*. T. 13. Vilnius 1992. P. 43–118.

[16] Э. Гудавичюс, *История Литвы.* Т. I: *с древнейших времен до 1569 года* / науч. Ред. Е. Л. Назарова; пер. Г. И. Ефремова. Москва 2005.

па пачатак XVI стагоддзя”[17]. Аўтар падзяліў свой артыкул на тры часткі: Рыцарства ў эпоху Позняга Сярэднявечча; Рыцарства пры двары вялікага князя літоўскага; Тэрмін Miles strenuus у ВКЛ у XVI стагоддзе. Таксама ёсць прылажэнне у якім даследчык дае пералік пасаваных у рыцары шляхцічаў ВКЛ (1400–1501). Пятраўскас сабраў і прааналізаваў вялікую колькасць матэрыялаў аб раннім этапе развіцця рыцарскай культуры ў ВКЛ. Навуковец даследуе значэнне тэрміну „рыцар” у вялікалітоўскіх дакументах таго часу, каб зразумець на колькі пашыранай была гэтая з’ява сярод шляхты. Асаблівая ўвага звяртаецца на вялікакняскія двары Вітаўта і Аляксандра Ягелончыка – панаванне гэтых манархаў разглядаецца як эпоха ўздыма рыцарскай культуры ў ВКЛ у XIV – XVI ст. Навуковец падрабязна апісвае факты праяваў рыцарскай культуры ў ВКЛ: пасаванне рыцараў, турніры, падарожжы „па рыцарскую навуку” ў іншыя краіны, прысутнасць рыцараў-іншаземцаў пры двары вялікага князя. Урэшце ён адзначае, што рыцарскія каштоўнасці былі вядомыя ў ВКЛ, але не сталі распаўсюджанай з’явай, бо рыцарская культура ў асноўным была засяроджана пры двары вялікага князя і абмяжоўвалася вузкім колам шляхты.

Артыкул Кастыціса Антанаіціса „Феномен рыцарства ў Літве у XIV–XVI ст.”[18] прысвечаны таму, калі і як з’явіліся літоўскія рыцары. У ім таксама ідзе гаворка аб паходжанні спецыфічнага характару і ўзвышэнні сацыяльнай групы рыцараў у сярэднявечнай Еўропе і Літве. Аўтар сцвярджае, што культура літоўскіх феадалаў мела больш агульнага з заходнееўрапейскай рыцарскай культурай, чым лічылася раней. Антанаіціс піша, што тэхнічны ўзровень узбраення літоўцаў у XV ст. набліжаецца да заходніх суседзяў (прыводзяцца археалагчныя і пісьмовыя звесткі), а менталітэт літоўскай

[17] R. Petrauskas, *Knighthood in the Grand Duchy of Lithuania from the late fourteenth to the early sixteenth centuries* [w:] *Lithuanian Historical studies II*, 2006. P. 39–66.

[18] K. Antanaitis, *Riterijos apraiškos Lietuvoje 14–16 amžiais* [w:] *Darbai ir Dienos Nom 5(14).* Kaunas, 1997. P. 125–142.

феадальнай эліты быў падобны на еўрапейскі – гэта прывяло да таго, што ідэі рыцарства маглі быць лёгка прыняты ў ВКЛ. Аднак заходнееўрапейскі культурны ўплыў не быў поўным. Літоўцы не прымалі турніры, культ Дамы, рыцарскую літаратуру і многія традыцыі паводзін рыцараў. У перыяд гаспадарання Вітаўта Вялікага знаць знаходзілася пад моцным уплывам цэнтральнай княскай адміністрацыі і менавіта адтуль ішоў распаўсюд заходняй рыцарскай культуры ў ВКЛ. Паступова, да канца XVI ст., слова „рыцар” стала сінонімам тэрміна „шляхціц”.

Яшчэ адзін літоўскі аўтар, які звяртаўся да нашай тэмы ў 1990–ыя гг. – Альвідас Нікжантайціс у сваім артыкуле „Асаблівасці літоўскага войска ў XIII–XV ст. (арганізацыя, тактыка, звычаі)” адзначае, што сутыкненне літоўцаў з заходнееўрапейскімі рыцарамі прывяло да арыентацыі літоўскіх элітаў на вобраз рыцара, а таксама паўплывала на распаўсюджванне элементаў рыцарскай культуры ў ВКЛ[19].

Нельга абыйсці ўвагай артыкул Юратэ Кяўпене „Вобраз рыцара Вялікага Княства Літоўскага ў тэкстах, напісаных Мацеем Стрыйкоўскім”[20]. Даследчыца спрабуе даць адказ на пытанне – ці існаваў у Вялікім Княстве Літоўскім класічны сярэднявечны інстытут рыцарства альбо на гэтых тэрыторыях прысутнічалі толькі яго атрыбуты? У артыкуле даецца шырокі агляд даследаванняў паяпрэднікаў, якія ў той ці іншай ступені займаліся пытаннем фенoмена рыцарства ў ВКЛ: К. Антанайціс, Х. Л. Буш, Э. Гудавічус, Н. Якавенка, Ф. Леантовіч, М. Любаўскі і А. Нікжэнтайціс. Каб адказаць на пытанне спадарыня Кяўпене выкарыстоўвае літаратурныя тэксты, напісаныя М. Стрыйкоўскім – адштурхваючыся ад іх, яна спрабуе зразумець якім быў вобраз рыцара ў ВКЛ XVI ст. Самога

[19] A. Nikžentaitis, *XIII–XV a. lietuvių kariuomenės bruožai (organizacija, taktika, papročiai)* [w:] *Karo archyvas.* T. 13. 1992. p. 3–33.

[20] J. Kiaupiene, *Kunigaikštystės riterio vaizdinys Motiejaus Stryjkovskio tekstuose', Kultūrų sankirtos. Skiriama doc. dr. Ingės Lukšaitės 60-mcčiui*, cd. Z. Kiaupa et al. Vilnius 2000, p. 117–141.

Мацея Стрыйкоўскага аўтарка называе рыцарам Вялікага Княства Літоўскага XVI ст., які пісаў для такіх жа рыцараў. Яна прыходзіць да высновы, што паняцце рыцар у творах Стрыйкоўскага часцей за ўсё ўжываецца ў значэнне „герой". Для М.Стрыйкоўскага рыцар – гэта адважны салдат, воін, імі ён называе воінаў-герояў розных часоў і краін. Акрамя гэтага М. Стрыйкоўскі паслядоўна выкарыстоўвае слова „рыцары" ў дачыненні да шляхты рускіх земляў ВКЛ, падкрэсліваючы, што рускае дваранства ВКЛ мела больш старажытную традыцыю рыцарства, чым літоўскае. Таксама Кяўпене заўважае, што, чым больш гістарычнае апавяданне Стрыйкоўскага набліжаецца да XVI ст., тым часцей рыцарства атаясамліваецца з усёй шляхтай ВКЛ.

Падобныя тэзісы Юратэ Кяўпеня паўтарае і ў раздзеле „Сярэднявечныя рыцары ці *gentry* Вялікага Княства Літоўскага ранняга Новага часу?" сваёй кнігі „Мы, Літва". Шляхта Вялікага Княства Літоўскага. Грамадскае і прыватнае жыццё"[21]. Спадарыня Кяўпеня прааналізавала дакументы, творы эпохі ВКЛ, у якіх ужываўся тэрмін „рыцар", „рыцарства" у адносінах да шляхты гэтай дзяржавы. Асаблівая ўвага была звернутая на працы слыннага гісторыка Мацея Стрыйкоўскага, які гэты тэмін ужываў даволі часта. Аўтар складае вобраз той часткі грамадства ВКЛ якая звалася „рыцарствам", а напрыканцы раздзела на аснове ранейпрыведзенага матэрыялу спрабуе знайсці агульныя рысы паміж вялікалітоўскім „рыцарствам" і англійскімі gentry. Аднак канчатковага адказу – ці адпавядае „рыцарства" ВКЛ брытанскім gentry аўтар не дае.

Нягледзячы на тое, што яшчэ з 1990-ых гадоў у беларускай мастацкай, навукова-папулярнай, а часам і навуковай літаратуры пачаў ужывацца тэрмін „рыцарства", айчынная гістарыяграфія не можа пахваліцца комплексным вывучэннем праблемы. Пры ўжыванні дадзенага тэрміна беларускія аўтары карыстаюцца тымі жа

[21] J. Kiaupiene, *„Mes, Lietuva" Lietuvos Didžiosios Kunigaikštystės bajorija XVI a. (viešasis ir privatus gyvenimas)"*. Vilnius 2003.

матывамі, што і іх літоўскія калегі: неабходна паказаць беларусам, што яны таксама з'яўляюцца спадчыннікамі таямнічага, яскравага света рыцарства, што Беларусь таксама ёсць краінай еўрапейскай культуры. Аднак тэзіс пра існаванне рыцарства ў ВКЛ так і не знайшоў грунтоўнага пацверджання ў навуковых працах беларускіх гісторыкаў.

У кантэксце даследвання рыцарскай культуры беларускімі навукоўцамі, можна прыгадаць артыкул „Рыцары”[22] аўтарства вядомага гісторыка Анатоля Пятровіча Грыцкевіча, змешчаны ў першым томе „Энцыклапедыі ВКЛ”, аднак ён даволі павярхоўны і не мае вялікага аб'ёма, што звязана з фарматам „Энцыклапедыі”. Большую частку артыкула, напісанага ў ключы савецкай гістарыяграфіі, займае тлумачэнне тэрміну рыцарства ў кантэксце Заходняй Еўропы. Напрыканцы, у адным абзацы, навуковец коратка ўзгадвае асноўныя дакументы эпохі ВКЛ, у якіх фігуруе гэты тэрмін. Аўтар кажа пра асаблівасці ў разуменні феномена рыцарства на тэрыторыі ВКЛ – ён сцвярджае, што рыцарствам тут называлі коннікаў-феадалаў, а сам тэрмін „рыцар” адпавядаў „шляхцічу” і “баярыну”.

Аднак беларуская навука можа пахваліцца грунтоўнымі працамі, якія разглядаюць розныя аспекты шляхецкай культуры ў ВКЛ – некаторыя з іх будуць надзвычай карысны для вывучэння феномена рыцарства. Адной з самых вядомых у гэтым шэрагу з'яўляецца праца Юрыя Бохана „Турнірныя традыцыі ў Вялікім княстве Літоўскім у XIV–XVI стагоддзях”[23]. У кнізе разглядаецца далучанасць феадальнай эліты Вялікага княства Літоўскага да еўрапейскіх турнірных традыцый у часы Позняга Сярэднявечча. Звяртаецца ўвага на пачатак распаўсюджання ў ВКЛ турнірнай практыкі, віды турнірных практыкаванняў і спецыфічны турнірны рыштунак.

---

[22] *Рыцары* [w:] *Вялікае княства Літоўскае: Энцыклапедыя. У 2 т.* Т. 1: *Абаленскі – Кадэнцыя* / Рэдкал.: Г.П. Пашкоў (гал. рэд.) [і інш.]. Мінск 2005.

[23] Бохан Ю.М. *Турнірныя традыцыі ў Вялікім княстве Літоўскім у XIV–XVI стагоддзях*. Мінск 2008.

Яшчэ адна праца аўтара „Узбраенне насельніцтва беларускіх зямель у XIV – XVI стагоддзях”[24] прысвечана эвалюцыі зброі на тэрыторыі Беларусі ў эпоху ВКЛ. У ёй разглядаюцца розныя катэгорыі наступальнага і засцерагальнага ўзбраення, мясцовыя традыцыі, а таксама заходнія і ўсходнія ўплывы на развіццё вайсковай справы. У кантэксце рыцарскай культуры яна карысна тым, што добра паказвае працэс „вэстэрнізацыі” ўзбраення ў ВКЛ, асаблівую цікавасць выклікае інфармацыя пра пласцінавыя даспехі, якія выкарыстоўваліся феадальнай элітай дзяржавы (прыгадаем багацейшы збор Радзівілаў у Нясвіжы) і былі характэрныя для еўрапейскага рыцарства таго часу.

Неабходна ўзгадаць і кнігу, напісаную Юрыем Мікалаевічам разам з Анастасіяй Скеп’ян, „Побыт феадалаў Вялікага Княства Літоўскага ў XV – сярэдзіне XVII стагоддзя”[25], якая адлюстроўвае важнейшыя аспекты матэрыяльнай культуры феадалаў – жыллё, харчаванне, адзенне, вялікая ўвага надаецца баўленню вольнага часу – паляванню, рыцарскім турнірам, гульням і забавам. Праца комплексна паказвае „знешнія” атрыбуты жыццядзейнасці феадалаў ВКЛ і тым самым дазваляе правесці параўнанне з еўрапейскай рыцарскай культурай, паказаць падабенства і адрозненне гэтых двух сацыяльных груп.

Хацелася б адзначыць, што Юры Бохан браў актыўны ўдзел у беларускім рэканструктарскім русе, дапамагаў вядомаму клубу „Княжы Гуф” у стварэнні рыцарскіх даспехаў. Дарэчы, гэты клуб займаўся не толькі папулярызацыяй вайсковай гісторыі ВКЛ і гістарычнай рэканструкцыяй, але і падрыхтоўкай гістарычных праектаў – так у 2008 г. у Нацыянальным гістрычным музеі удзельнікамі клуба была арганізавана выстава „Рыцары Вялікага княства”. Агулам рэканструктарскі рух на Беларусі – важная старонка ў гісторыі

---

[24] Бохан Ю.М. *Узбраенне насельніцтва беларускіх зямель у XIV–XVI стагоддзях*. Мінск: Беларусь, 2012.

[25] Бохан Ю.М. Скеп’ян А.А. *Побыт феадалаў Вялікага Княства Літоўскага ў XV – сярэдзіне XVII стагоддзя*. Мінск 2011.

папулярызацыі рыцарскай культуры на Беларусі, аднак гэта тэма асобнага даследавання.

Трэба сказаць, што рыцарскія ідэалы былі важнай часткай сармацкай культуры шляхты Рэчы Паспалітай. Феномен рыцара-воіна, рыцара-абаронцы Айчыны і Веры эпохі сарматызму быў апісаны ў працах: „Сармацкая культура беларускай шляхты ў XVI–XVIII стагоддзях”[26] беларускай даследчыцы Лады Клімуць і “Міфы і вобразы сарматызма. Вытокі нацыянальнай ідэалогіі Рэчы Паспалітай”[27] расійскага навукоўца Марыі Лескінен. Аўтаркі даюць падрабязны аналіз асноўных рысаў сармацкага міфа, ідэала і вылучаюць у якасці адной з галоўных роляў шляхціча-сармата – роль воіна-рыцара. Лада Яраславаўна прыходзіць да высновы, што шляхта ВКЛ XVI–XVII ст. успрыняла заходнееўрапейскую рыцарскую этыку, перапрацаваўшы яе на свой манер, дадаўшы сармацкі каларыт, а Марыя Войтаўна сцвярджае, што пералік рысаў, які быў уласцівы для „польскага рыцара” цалкам адпавядае тым, што былі характэрныя для заходнееўрапейскага рыцара.

Асобна прыгадаем працу Наталлі Якавенка „Украінская шляхта з канца XIV да сярэдзіны XVII стагоддзя. Валынь і Цэнтральная Украіна” у якой яна разглядае гісторыю прывіліяванага стану на тэрыторыі Украіны у складзе ВКЛ і Польшчы[28]. Першы раздзел кнігі пачынаецца з даследвання пераходу „баяр-рыцараў” (так у Якавенка) да баяр-шляхты, гаворка ідзе пра перабудову старажытнарускай структуры баярства ў часы Вялікага Княства Літоўскага. Нягледзячы на тое, што кніга павярхоўна закранае тэму рыцарства, яна карысна аналізам развіцця шляхецкага (рыцарскага) стану ў кантэксце феадальнага грамадства. Гэта дае добры грунт не

---

[26] Клімуць Л.Я. *Сармацкая культура беларускай шляхты ў XVI–XVIII стагоддзях*. Мінск 2013.

[27] Лескинен М. В. *Мифы и образы сарматизма. Истоки национальной идеологии Речи Посполитой*, Москва 2002.

[28] Н. М. Яковенко, *Українська шляхта з кінця XIV до середини XVII ст. Волинь і Центральна Україна*. Київ 1993.

толькі для роздумаў пра лёсы рыцарства ў ВКЛ, але і для параўнанняў з тымі ж працэсамі ў Заходняй Еўропе.

## Спецыяльная літаратура

Трэба памятаць, што феномен рыцарства ўключае ў сябе не толькі матэрыяльную культуру, але і духоўную, важным элементам якой ёсць літаратура. Вядомым знаўцам гэтай часткі рыцарскай культуры з'яўляецца беларускі даследчык Аляксандр (Алесь) Бразгуноў, які напісаў манаграфію „Перакладны рыцарскі і гістарычны раман Беларусі XV – XVI стст."[29]. У кнізе даследуюцца пытанні гісторыі і эвалюцыі папулярных жанраў беларускай перакладной літаратуры Позняга Сярэднявечча – рыцарскага і гістарычнага рамана, разглядаюцца ў параўнанні з еўрапейскімі крыніцамі такія помнікі перакладнога пісьменства, як „Трышчан", „Бава", „Александыя", „Троя", „Атыла". Алесь Уладзіміравіч звяртае ўвагу на „адрозны ад заходнееўрапейскага рыцарства погляд на сваю ролю ў жыцці" шляхты ВКЛ. Ён адзначае, што вялікалітоўская шляхта не мела той ідэйна-эстэтычнай, асновы, на якой грунтавалася культура заходнееўрапейскага рыцарства, то бок для яе тэрмін „рыцарства" не ўтвараў адзіны ментальны комплекс, харэктэрны для заходнееўрапейскага рыцарства. На аснове вывучэння тэкстаў перакладных рыцарскіх раманаў даследчык разважае пра адрозненні і падабенства ў разуменні панятка „рыцарства" ў вялікалітоўскіх і заходнееўрапейскіх феадалаў.

Яшчэ адзін вядомы беларускі даследчык літаратуры ВКЛ Сяргей Кавалёў з'яўляецца аўтарам цэлага шэрагу даследванняў[30]

[29] А.У. Бразгуноў, *Перакладны рыцарскі і гістарычны раман Беларусі XV–XVI стст.: еўрапейскі кантэкст, трансфармацыя і эвалюцыя жанру*: Аўтарэф. дыс. на атрыманне вучон. ступ. канд. філал. навук: 10.01.01.Мінск, 2002.

[30] С.В. Кавалёў, *Героіка-эпічная паэзія Беларусі і Літвы канца XVI ст.*. Мінск: Універсітэцкае, 1993. Кавалёў С.В. *Літаратура Вялікага Княства Літоўскага XVI – пачатку XVII ст.: феномен культурнага памежжа*. Мінск 2011. С.В. Ка-

у якіх разглядаюцца творы, прысвечаныя вайсковым канфліктам і вядомым дзеячам мілітарнай гісторыі XV–XVII стагоддзяў. Гэтыя творы, створаныя ў розных жанрах шматмоўнага пісьменства ВКЛ (эпіграматычная, эпічная паэзія, мемуары) раскрываюць вайсковыя ідэалы шляхты ВКЛ, даюць уяўленне пра тое, чым быў тэрмін „рыцарства" для аўтараў гэтых твораў і шырэй для ўсяго шляхецтва.

З гэтага жа пункта гледжання для нас былі карыснымі такія навуковыя працы беларускіх даследчыкаў, як „Беларуская лацінамоўная паэзія: ранні рэнесанс", „Беларуская лацінамоўная паэзія: позні рэнесанс і ранняе Барока"[31] аўтарства Жанны Некрашэвіч-Кароткай, „Кніжна-эпіграматычная паэзія Вялікага Княства Літоўскага XVI ст. у кантэксце антычнай традыцыі"[32] Ганны Карповіч, „Старажытная паэзія Беларусі XVI – першая палова XVII ст."[33] Івана Саверчанкі, а таксама артыкул Уладзіміра Канановіча „Пахвала князя Канстанціна Астрожскага" як крыніца для вывучэння ідэнтычнасці праваслаўнай эліты ВКЛ пачатку XVI стагоддзя"[34].

валёў, *Шматмоўная паэзія Вялікага Княства Літоўскага эпохі Рэнесансу*. Мінск 2010.

[31] Ж.В. Некрашэвіч-Кароткая, *Беларуская лацінамоўная паэзія: ранні Рэнесанс*. Мінск 2009. Ж.В. Некрашэвіч-Кароткая, *Беларуская лацінамоўная паэма: позні Рэнесанс і ранняе Барока*. Мінск 2011.

[32] Г. А. Карповіч, *Кніжна-эпіграматычная паэзія Вялікага Княства Літоўскага XVI ст. у кантэксце антычнай традыцыі.* Інстытут Славянскай Філалогіі Універсітэта Марыі Кюры-Складоўскай у Любліне, Польскі Інстытут у Мінску. Мінск 2012.

[33] І. В. Саверчанка, *Старажытная паэзія Беларусі XVI – першая палова XVII ст.* / Рэд.А.І.Мальдзіс; АН Беларусі.Ін-т літ.імя Я.Купалы.Фонд фундам.даслед. Рэсп.Беларусь. Мінск 1992.

[34] У. Кананові, *„Пахвала князя Канстанціна Астрожскага як крыніца для вывучэння ідэнтычнасці праваслаўнай эліты ВКЛ пачатку XVI стагоддзя"* [w:] *Arche Пачатак; № 12 (133). Бітва пад Оршай: месца памяці і канфлікт інтэрпрэтацый*. Мінск 2014. С. 736–752.

## Мастацтва

Пры вывучэнні рыцарскай культуры ў ВКЛ неабходна спыніцца на тэме вобраза рыцара ў мастацтве. Тут мы можам прыгадаць кнігу Л.Я. Клімуць „Сармацкая культура беларускай шляхты ў XVI – XVIII стагоддзях", дзе даецца апісанне мастацтва эпохі сарматызма, важнай часткай якой быў мілітарны, рыцарскі кампанент.

Унікальным артэфактам эпохі, якую мы абралі для даследвання, з'яўляецца карціна „Бітва пад Оршай". Гэта выбітны твор батальнага мастацтва, аб'ект для вывучэння зброі і адзення таго часу, адзін з важнейшых сімвалаў сённяшняга канструявання гераічнай мінуўшчыны народаў былога ВКЛ. Для нашай тэмы твор важны тым, што мала-дзе з такой дакладнасцю выяўлены сюжэт з гісторыі Княства, у якім цэнтральнае месца займаюць ваяры, якіх можна назваць рыцарамі. Нягледзячы на тое, што большасць выяўленых на карціне рыцараў мела польскае паходжанне (літоўская кавалерыя ў той час мела больш лёгкі характар), карціна і сёння іграе важную ролю ва ўкараненні думкі пра наяўнасць рыцарства ў старажытнай Літоўскай дзяржаве сярод патрыятычных колаў нацый былога ВКЛ. Карціне прысвечана некалькі значных артыкулаў[35], але мы звярнем ўвагу на працу даследчыка з Ужгарада Уладзіміра Гуцула „Карціна

[35] M. Janicki, *Obraz Bitwa pod Orszą – geneza, datowanie, wzory graficzne a obraz bitwy „na Kropiwnej" i inne przedstawienia batalistyczne w wileńskim pałacu Radziwiłłów* [w:] *Bitwa pod Orszą,* red. M. Nagielski. Warszawa 2015.

3. Жыгульскі, *„Бітва пад Оршай" – аналіз структуры карціны* [w:] *Arche Пачатак;* № 12 (133). *Бітва пад Оршай: месца памяці і канфлікт інтэрпрэтацый*. Мінск 2014. С. 354–401.

А. Болдыраў, *Карціна „Бітва пад Оршай" і даследванне яе прыдатнасці для вывучэння гісторыі ўзбраення. Да пытання аб гістарыяграфіі легендарнага палатна* [w:] *Arche Пачатак;* № 12 (133). *Бітва пад Оршай: месца памяці і канфлікт інтэрпрэтацый*. Мінск 2014. С. 441–456.

В. Гуцул, *„Конно і збройно". Образи представників руських воєнних еліт на памятці станкового живопису першої третини XVI ст. „Битва під Оршею": спроба ідентифікації.* [w:] *Sredniowiecze Polskie i Powszechne.* Т. 6(10). Katowice 2014. С. 334–349.

„Бітва пад Оршай” – прыдворная прапаганда ці рыцарскі эпас?”[36], у якой аўтар кажа пра неабходнасць разгляду карціны праз прызму рыцарскай культуры, пра погляд на яе як на артэфакт сымбалічнай камунікацыі. Даследчык прыходзіць да высновы, што карціна ёсць прыкладам адлюстравання рыцарскай традыцыі элітаў Польшчы і ВКЛ.

Прыгадаем яшчэ адзін артыкул аўтара „Іканаграфія харызмы: вобраз князя Канстанціна Астрожскага (1460–1530) у дакументальнай баталістыцы першай траціны XVI ст.”[37], дзе ён вывучае выявы знакамітага палкаводца – у першую чаргу даследчык звяртае ўвагу на карціну „Бітва пад Оршай”. Гуцул лічыць, што князь паказаны на карціне не толькі як палкаводзец, але і як рыцар, што свядома рызыкуе ўласным жыццём у баі.

Важным аспектам рыцарскай культуры з’яўляецца геральдыка – навука пра гербы. Вядучым беларускім даследчыкам геральдыкі ВКЛ Аляксеем Іванавічам Шаландай была напісана праца „Таямнічы свет беларускіх гербаў. Шляхецкая геральдыка Вялікага княства Літоўскага”[38], у якой раскрываецца сутнасць і шляхі развіцця гербаў шляхты ВКЛ. У сутнасці гэтая кніга – выклад гісторыі шляхецкай сымболікі, навуковае даследаванне геральдыкі і сфрагістыкі ВКЛ канца XIV–XVIII ст.

Паколькі тэрмін „рыцарства” уключае ў сябе вялікі дыяпазон мілітарных, культурных, побытавых аспектаў, неабходна адзначыць, што існуе вялікая колькасць даследванняў, прысвечаных тэмам, каторыя апасродкава тычыцца прадмета нашага агляда:

---

[36] У. Гуцул, *Карціна „Бітва пад Оршай” – прыдворная прапаганда ці рыцарскі эпас?* [w:] *Arche Пачатак;* № 12 (133). *Бітва пад Оршай: месца памяці і канфлікт інтэрпрэтацый*. Мінск: Гайсак 2014. С. 401–441.

[37] В. Гуцул, *Іконографія харизми: образ князя Костянтина Острозького (1460–1530) в документальній баталістиці першої третини XVI ст.* [w:] *Острозька давнина.* Вип. 3. Остріг, 2014. – С. 7–20.

[38] А.І. Шаланда, *Таямнічы свет беларускіх гербаў: шляхецкая геральдыка Вялікага княства Літоўскага*. Мінск: А. М. Янушкевіч, 2014.

мастацтва[39] [40] [41] [42] [43], прававое развіццё дзяржавы[44] [45], родавыя легенды [46], архітэктура феадальных замкаў [47] [48], пахавальная культура шляхты [49] [50] і іншае.

---

[39] А.А. Ярошевич, *От ренессанса к барокко: мемориальная и алтарная пластика Беларуси XVII–XVIII веков* . Минск 2019.

[40] А. К. Лявонава, *Старажытнабеларуская скульптура*. Мінск 1991.

[41] М. Матушакайте, *Литовская надгробная скульптура эпохи Ренессанса и раннего барокко* [w:] Искусство Прибалтики. Таллинн, 1981.

[42] Л. И. Тананаева, *Сарматский портрет: из истории польского портрета эпохи барокко*. Москва 1979.

[43] А. Ю. Хадыка, Ю. В. Хадыка *Непаўторныя рысы: з гісторыі беларускага партрэта*. Мінск 1992.

[44] С. Лазутка С., И. Валиконите, Э. Гудавичюс, *Первый Литовский Статут (1529 г.).* Вильнюс 2004.

[45] Я.А. Юхо, *Гісторыя дзяржавы і права Беларусі: Вучэбн. дапам.* Мінск 2000.

[46] R. Petrauskas, *Socialiniai ir istoriografiniai lietuvių kilmės iš romenų teorijos aspektai* [w:] *Literatūros istorija ir jos kurėjai.* Lietuvių literatūros ir tautosakos institutas; red. S. Narbutas. Vilnius 2004. P. 270–285.

[47] М. Волкаў, *Мірскі замак у XVI–XVIII стст.: гісторыя будаўніцтва і эвалюцыя функцыянальнага прызначэння* [w:] Беларускі гістарычны часопіс. 2016. № 9. С. 29–45.

[48] Н. А. Волков, *Уподобляясь монархам: символика магнатских резиденций в Великом княжестве Литовском в конце XV – середине XVII в.* [w:] *Вызов времени: становление централизованных государств на Востоке и Западе Европы в конце XV–XVII вв*. Калуга 2019. С. 94–101.

[49] Д.В. Лісейчыкаў, *„Ходилъ до церкви и тамъ надгробокъ писаныи виделъ…» Кірылічныя надмагіллі XVI – XVII стст. на землях Вялікага Княства Літоўскага.* [w:] *Epitaphium: пахавальная культура народаў Вялікага Княства Літоўскага: зборнік артыкулаў*. Мінск 2022. С.69–102.

[50] Н.В. Стахно, *Пахавальная цырымонія эпохі барока як частка рэпрэзентацыі шляхты Вялікага Княства Літоўскага // Epitaphium: пахавальная культура народаў Вялікага Княства Літоўскага: зборнік артыкулаў.* Мінск 2022. С.121–131.

## Старажытнарускія дружыннікі. Рыцарства Ордэна і Польшчы.

На наш погляд пры вывучэнні рыцарства ў ВКЛ нельга забывацца на старажытнарускіх дружыннікаў, бо гэты прывіліяваны пласт сярэднявечнага грамадства пры стварэнні Літоўскай дзяржавы нікуды не знік, а з часам уліўся ў шляхецкі стан. Для нас уяўляе цікавасць пытанне – а наколькі блізкімі была ідэалогія, культура, сацыяльнае становішча старажытнарускай дружыны і еўрапейскага рыцарства? Адным з першых яго падымае Мікалай Дашкевіч у сваёй працы „Рыцарства на Русі". Аўтар звяртае ўвагу на тое, што розныя народы і культуры мелі такі пласт, які ў заходнееўрапейскай культуры называецца рыцарствам – на Русі яму адпавядаюць дружыннікі. Аналізуючы дакументальныя крыніцы і паэтычную спадчыну Русі, Дашкевіч прыходзіць да высновы, што ў рускіх эліт былі падобныя да рыцарскіх погляды на воінскі гонар і славу. Таксама ён звяртае ўвагу на тое, што ў старажытнарускую эпоху ішоў працэс пранікнення заходнееўрапейскай, у тым ліку рыцарскай, культуры на Русь. З аднаго боку яна пранікла з поўначы – з Ноўгарада Вялікага праз стасункі з паўночнаеўрапейскімі краінамі, з іншага – з Польшчы, Вугоршчыны, Чэхіі. Эліты Русі былі знаёмыя з рыцарскай паэзіяй, турнірамі, феноменам крыжовых паходаў, але пры тым, як піша Дашкевіч, заходнееўрапейскае рыцарства і старажытнаруская дружына ўсё ж не былі адным і тым жа.

